## ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

**С. Я. Новікаў**

# ЛЮДСКІЯ І ПРЫРОДНЫЯ РЭСУРСЫ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ: ПАНАРАМА ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ І ВЫПРАБАВАННЯЎ

*Thomas M. Bohn, Aliaksandr Dalhouski, Markus Krzoska.* Wisent-Wildnis und Welterbe. Geschichte des polnisch-weißrussischen Nationalparks von Bialowieza. – Köln ; Weimar ; Wien : Böhlau Verl. GmbH&Cie, 2017. – 364 S.

Калектыўная манаграфія, прысвечаная гісторыі еўрапейскіх зуброў на беларуска-польскім памежжы, больш вядомым як Белавежская пушча, з'яўляецца вынікам паспяховага супрацоўніцтва гісторыкаў Беларусі, Германіі і Польшчы ў рамках навуковага праекта «Белавежскі нацыянальны парк. Чалавек, жывёла і наваколле на польска-беларускім памежжы» (2014–2017). Даследчыкі Аляксандр Далгоўскі, Томас Бон і Маркус Кжоска выкарысталі дакументальныя крыніцы з 37 архіўных і бібліятэчных фондаў Беларусі, Германіі, Польшчы і Расіі для таго, каб на сучасным узроўні навуковых ведаў разгарнуць шырокую панараму гістарычных падзей, звязаных з захаваннем унікальнага помніка прыроды на тэрыторыі цяперашняга беларуска-польскага памежжа. Спроба аўтараў намаляваць агульную карціну ўзаемадзеяння чалавека і прыроды, пачынаючы аналіз з падзей далёкага гістарычнага мінулага і даводзячы да цяперашняга часу, заслугоўвае асаблівай павагі, перш за ўсё ў даследчыкаў гэтай праблемы, па-другое, у зацікаўленых чытачоў, па-трэцяе, у тых, хто хацеў бы знайсці адказы на малавядомыя, дыскусійныя ці праблемныя пытанні ў няпростай справе захавання «запаведнасці»[1] для апошняй еўрапейскай пушчы. Выкананае ў арыгінальным навуковым жанры даследаванне можна кваліфікаваць як адметную навуковую каштоўнасць не столькі для нацыянальнай беларускай ці польскай, колькі для сучаснай еўрапейскай і сусветнай гістарыяграфіі. У прадстаўленым фармаце праца зроблена ўпершыню.

Выданне складаецца з 9 частак разам з уводзінамі і заключэннем. Выкарыстаная структура дазволіла аўтарам працы прадставіць чытачу шматлікія аспекты, зрабіўшы акцэнт на вызначэнні важнейшых падзей гісторыі гэтага ўнікальнага рэгіёна, паказаць станоўчыя і адмоўныя вынікі ўздзеяння чалавека на прыроду, раскрыць маштабы вытворчага выкарыстання і рабавання лясных і прыродных рэсурсаў пушчы, асабліва за часам дзвюх сусветных войнаў, а таксама выявіць тэндэнцыі развіцця гэтай ахоўнай зоны ў пасляваенны час і на цяперашнім этапе. Заслуга аўтараў заключаецца

[1] Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 445 с.

ў тым, што ў даследаванні яны імкнуліся кіравацца прынцыпам паўнаты крыніц, што дазволіла ім усебакова распавесці пра гістарычны лёс двух галоўных аб'ектаў навуковых пошукаў – зубра і пушчы/пушчы і зубра. Важна, што аўтары вылучалі сярод задач раскрыццё асноўных этапаў, звязаных з гісторыяй фарміравання прыроднагаляснога масіву і яго пераўтварэння ў запаведную зону, сферу вытворчасці лесаматэрыялаў і аб'ект турызму, асабліва ва ўмовах сучаснай інтэрнацыяналізацыі і камерцыялізацыі (с. 5–6).

У другой частцы (с. 21–61) аўтары знаёмяць чытача з хронікай дзяржаўнай манапалізацыі лясных рэсурсаў у раёне пушчы, пачынаючы ад сярэдзіны XVI стагоддзя, калі з ляснога масіву ўпершыню была створана паляўнічая гаспадарка, якая існавала да пачатку XX стагоддзя. Асаблівую навуковую каштоўнасць у гэтай главе ўяўляе табліца 1 (с. 37–38), якая ўтрымлівае статыстычныя даныя аб папуляцыі зуброў Белавежскай пушчы ў перыяд з 1821 па 1919 г., у тым ліку звесткі аб знікненні апошняга зубра ў 1920 г. Пры гэтым з табліцы вынікае, што самай вялікай папуляцыя белавежскіх зуброў стала ў 1897 г. (с. 60). Адметна, што кажучы пра гістарычны рубеж узнікнення пушчы, аўтары адыходзяць ад агульнапрынятай у беларускай і польская гістарыяграфіі даты 1409 г. ці года першай згадкі пушчы ў Хроніцы Я. Длугаша, а абапіраюцца ў сваім даследаванні на спецыяльны закон аб ахове лесу і звяроў, выдадзены вялікім князем літоўскім і каралём польскім Жыгімонтам I у 1538 г. (с. 26).

Трэцяя частка (с. 62–84) ахоплівае гады Першай сусветнай вайны, калі германскае ваеннае камандаванне спрабавала стварыць на тэрыторыі пушчы «ўзорную гаспадарку» з улікам афрыканскага каланіяльнага вопыту (с. 73). З аднаго боку гэта выклікала суцэльную вырубку лясоў пушчы, каб забяспечыць у дрэве патрэбы рэйха, а з другога – гарантавала селекцыю і захаванне канкрэтнага ляснога фонду з мэтай стварэння спрыяльных умоў для палявання высокіх асоб. Аналізуючы вынікі рэалізацыі такога праекта ў пушчы, аўтары прыходзяць да наступнай высновы: вынікі адступлення часцей рускай арміі з раёна Белавежскай пушчы можна параўнаць з палітыкай «выпаленай зямлі», наступствы ж больш чым двухгадовага кіравання германскай ваеннай адміністрацыі на тэрыторыі Обер Ост пакінулі важную гаспадарчую інфраструктуру, у тым ліку 6 піларам, асобныя дрэваапрацоўчыя фабрыкі, некалькі майстэрняў і палявых пад'язных пуцей (с. 75).

У чацвёртай частцы (с. 85–143) вызначаюцца гістарычныя адметнасці міжваеннага існавання як самой Белавежскай пушчы, так і яе прамысловай інфраструктуры ва ўмовах аднаўлення II Рэчы Паспалітай. Аўтары вылучаюць агульную тэндэнцыю развіцця гэтай тэрыторыі, звязаную не толькі з актыўным правядзеннем палітыкі паланізацыі, але і неабходнасці мадэрнізацыі гэтага рэгіёна. У першым выпадку на замену праваслаўнай прыходзіць польска-каталіцкая мадэль паўсядзённасці; у другім – галоўны сэнс мадэрнізацыі ўсходніх крэсаў зводзіўся да больш маштабнай эксплуатацыі лясных рэсурсаў (с. 113). Аўтары паказваюць, што з канца 1920-х гадоў мястэчка Белавежа набывае сваю знакавую адметнасць дзякуючы шырокаму развіццю

сферы палявання, якое праводзілася на дзяржаўным узроўні для прадстаўнікоў польскай і іншых дзяржаў, дыпламатаў і шматлікіх замежных гасцей (с. 124). Аўтары адзначаюць, што турызм пачаў займаць важнае месца ў паўсядзённым жыцці Белавежскага прыроднага запаведніка, асабліва пасля таго як ў 1932 г. адбыліся істотныя структурныя змены ў сувязі з рэструктурызацыяй яго ў польскі нацыянальны парк (с. 134).

У пятай частцы (с. 144–178) паказаны, з аднаго боку, вынікі саветызацыі ўсходняй часткі Белавежскай пушчы, а з другога – ход яе пераўтварэння ў спецыяльную зону для палявання нацысцкай эліты. У першым выпадку ў працы прыводзяцца шматлікія факты пра тое, што ў адпаведнасці з палітыкай па ахове прыроды савецкая ўлада імкнулася пераўтварыць пушчу у запаведнік, забараняючы будаваць на яго тэрыторыі дамы адпачынку і санаторыі, аднак пры гэтым разглядаючы яе рэсурсы у тым ліку і праз прызму гаспадарчага выкарыстання (с. 153). Цікавымі бачацца нам згаданыя аўтарамі факты аб тым, што ў той час першы дырэктар запаведніка шукаў новыя магчымасці для выкарыстання зуброў у народнай гаспадарцы; напрыклад, іх скрыжоўванне з каровамі. Што на справе рэалізаваць не ўдалося.

У другім выпадку, кажучы пра гады Другой сусветнай вайны, аўтары адзначаюць, што на долю жыхароў гэтага рэгіёна выпала «драматычная фаза гісторыі» (с. 167). Калі у час нацысцкай акупацыі Белавежскай пушчы папуляцыя зуброў фактычна захавалася без істотных страт, дык гэтага нельга сказаць пра лёс жыхароў прылеглых вёсак, на месцы якіх планавалася стварыць спецыяльную зону для палявання; тэрыторыя пушчы павінна была павялічыцца больш чым удвая шляхам правядзення мерапрыемстваў па бязлітасным вынішчэнні мясцовага насельніцтва. У апошнім выпадку гэта прывяло да масавых расстрэлаў яўрэяў і актывістаў, а таксама высялення мясцовых жыхароў, што адпавядала германскай акупацыйнай палітыцы тэрору і прыгнечання (с. 167). Адказам на яе з'яўлялася дзейнасць савецкіх партызан, у выніку якой станавілася амаль немагчымым паляванне ў Белавежскай пушчы. Аднак самыя значныя страты жывёльнаму свету на тэрыторыі пушчы былі нанесены падчас адыходу нямецкіх войскаў і вызвалення мясцовасці ў ходзе аперацыі «Баграціён» у сярэдзіне ліпеня 1944 г. (с. 178).

У шостай частцы (с. 179–251) аўтары раскрываюць характар змен, што адбыліся на тэрыторыі пушчы, якая пасля вайны стала часткай сацыялістычнай Польшчы. Усталяванне пасляваенных міждзяржаўных меж прывяло да падзелу ляснога масіву паміж Польскай Народнай Рэспублікай і Савецкім Саюзам, што пярэчыла першапачатковым намерам польскага боку аб стварэнні вакол пушчы адзінага нацыянальнага парку. Аўтары адзначаюць, што змены, якія мелі месца ў пушчы на працягу наступных 40 гадоў, сведчаць аб тым, што асновай развіцця пушчы з'яўлялася канцэпцыя, якая спалучала комплекс мер па ахове нацыянальнага парку і эканамічным выкарыстанні яго тэрыторыі. У першым выпадку гэта прывяло да падзелу парку на тры часткі, у тым ліку ландшафтную, заселеную і турыстычную

зоны, якія існуюць і сёння (с. 230). Разам з арганізацыйнымі вырашаліся пытанні навуковага забеспячэння далейшага захавання жывёльнага статку, у тым ліку абгрунтаванага павелічэння колькасці розных звяроў, сярод якіх асаблівая ўвага надавалася зубрам. Паляванне на іх было спачатку пад забаронай, але з сярэдзіны 1950-х гадоў стала магчымым і ладзілася толькі ў спецыяльнай ахоўнай зоне.

У сёмай частцы (с. 252–299) разглядаецца лёс Белавежскай пушчы ў складзе савецкай Беларусі ў пасляваенны час. Аўтары паказваюць яе гісторыю, зыходзячы з кантэксту польскай канцэпцыі, якая спалучала дзве ідэі – стварэнне нацыянальнага парку і гаспадарчае выкарыстанне яго ваколіц. Паводле савецкага падыходу, у пераліку задач і функцый, якія сталі вядомымі толькі ў пачатку 1950-х гадоў, для прыроднага запаведніка былі вызначаны «аднаўленне агульнага жывёльнага фонду, яго ахова і вывучэнне, а таксама вырошчванне зуброў з мэтай іх рассялення на тэрыторыі Белавежскай пушчы і ў іншых месцах СССР» (с. 257). Развіццё турызму моцна абмяжоўвалася ў сувязі са знаходжаннем запаведніка ў прыгранічнай зоне і неабходнасці атрымання спецыяльнага дазволу на ўезд на ахоўную тэрыторыю. Аўтары адзначаюць, што прынцыповыя змены ў лёсе Белавежскай пушчы адбываюцца пасля жніўня 1957 г., калі быў прыняты ўрадавы загад аб пераўтварэнні пушчы ў дзяржаўную запаведна-паляўнічую гаспадарку. Хоць згодна з загадам новая форма павінна надаць ёй не столькі гаспадарчае, колькі навуковае і культурнае значэнне (с. 273). Як адзначаецца ў даследаванні, пушча была абвешчана запаведнікам, закрытым для наведвання людзей, але адкрытым для палявання і адпачынку партыйнай і кіруючай эліты савецкай краіны. У выніку да пачатку 1990-х гадоў існавалі дзве паралельныя канструкцыі: запаведніка для зуброў і зоны палявання.

У восьмай частцы (с. 300–340) аўтары разглядаюць пушчу на этапе трансфармацыі і еўрапеізацыі. На прыкладзе польскай часткі пушчы аўтары паказваюць, што пасля 1989 г. узніклі пытанні, якія, з аднаго боку, сведчылі аб пашырэнні інтарэсу навукоўцаў і аматараў прыроды да паляпшэння ўмоў захавання і далейшага развіцця нацыянальнага парку, а з другога – зацікаўленасці мясцовых жыхароў у паляпшэнні свайго матэрыяльнага становішча шляхам фарсіраванага развіцця турызму і прамысловага выкарыстання гэтай тэрыторыі. Такім чынам у грамадстве сфарміравалася супярэчлівая канцэпцыя выбару шляхоў далейшага захавання прыроднай зоны (с. 305). Вывучэнне гісторыі Белавежскай пушчы ў постсавецкі перыяд дало аўтарам падставу зрабіць вывад аб тым, што для таго часу сталі характэрнымі інтэрнацыяналізацыя і камерцыялізацыя. У першым выпадку размова ідзе пра міжнароднае значэнне, асабліва пасля надання ў 1992 г. пушчы статусу Нацыянальнага парку «Белавежская пушча», які павінен служыць справе выхавання, адукацыі, навукі і культуры (с. 317). У той жа час на дзяржаўным узроўні ставіліся задачы аб неадкладным разгортванні гаспадарчай дзейнасці, што адпавядала патрабаванням пераходу суверэннай рэспублікі да рынкавай эканомікі. Дзеля чаго неабходна было як мага хутчэй надаць гэтаму прырод-

наму аб’екту формы аграрна-гандлёвага, прымыслова-турыстычнага і лесагаспадарчага комплексу. Рубяжом на гэтым шляху аўтары называюць 2009 г., калі ў Беларусі і Польшчы праходзілі ўрачыстасці з нагоды 600-гадовага юбілею, падчас якіх на дзяржаўным узроўні прагучаў заклік аб пераўтварэнні Белавежскай пушчы ў нацыянальную святыню (с. 338).

У заключэнні (с. 341–349) аўтары робяць важныя абагульненні: 1) паказваюць асноўныя падзеі гістарычнага развіцця пушчы; 2) разглядаюць пытанні фарміравання і эвалюцыі сістэмы аховы і выкарыстання багаццяў пушчы; робяць заключэнне аб тым, што калі не было б пушчы, то не было б і зуброў. Дзякуючы існаванню самой пушчы захаваліся зубры, так і дзякуючы існаванню зуброў захоўваецца пушча. З гэтым аўтарскім сцвярджэннем, падмацаваным не толькі багатай дакументальнай базай, але і вялікай колькасцю фотаздымкаў, часам унікальных і малавядомых, можна цалкам пагадзіцца, асабліва з улікам таго факта, што галоўным захавальнікам прыроднай спадчыны з’яўляўся чалавек. Менавіта ад яго залежаў лёс як пушчы, так і яго прыродных і жывёльных багаццяў. Шкада, што на фоне глыбокага аналізу падзей, звязаных з пушчай і зубрамі, дзікімі жывёламі і прыродным наваколлем, аўтары толькі закранулі этнаграфічныя адметнасці існавання чалавека, пакінуўшы для чытача шмат пытанняў аб паўсядзённым жыцці чалавека, яго побыце і культуры, стратэгіях выжывання ў розных гістарычных умовах на тэрыторыі Белавежскай пушчы.

Аналіз манаграфічнага даследавання, падрыхтаванага сумеснымі намаганнямі беларускага, нямецкага і польскага гісторыкаў, сведчыць аб уключэнні ў сферу навуковых пошукаў новых пазнавальных рэсурсаў, дзякуючы якім удалося не толькі паспяхова выканаць акадэмічны праект пра зуброў пушчы, але і ўнесці праз новыя веды, факты і крыніцы важны ўклад у пазнанне маладаследаваных праблем еўрапейскай гісторыі на беларуска-польскім памежжы.

*Поступила в редакцию 26.03.2019*

**В. Н. Усоский**

## МОНЕТАРНАЯ СИСТЕМА СЕРЕБРЯНОГО МОНОМЕТАЛЛИЗМА, БИМЕТАЛЛИЗМА И ЗОЛОТОГО СТАНДАРТА

14–27 сентября 2018 г. ФГАОУ ВО «Крымский федеральный университет имени В. И. Вернадского» проводит XII Международную школу-симпозиум АМУР-2018. Одной из актуальных тем, обсуждаемых на ней, была эволюция денег от физического тела товарных денег, воплощенных в драгоценных металлах (*full-bodied money*) до совершенной фидуциарной бесплотности (электронные импульсы). Фидуциарные деньги не обладают товарными чертами всеобщего трудового эквивалента, на определении которого настаивал К. Маркс, который создал неверное представление о содержании